# ІНСТЫТУТ ІНСТРУКТАРСТВА НА АКУПІРАВАНЫХ ПОЛЬСКІМІ ВОЙСКАМІ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1919-1920 гг.

**В. М. Бароўская**

Школьнае інструктарства – сістэма службовых асоб, якія даюць кіруючыя ўказанні прадстаўнікам навучальных устаноў па ажыццяўленню адукацыйнага працэса і праводзяць праверку правільнасці дзеянняў шляхам нагляду і інструктавання. Інструктарства, уведзенае пасля ўсталявання савецкай улады, не з’яўлялася наваўвядзеннем для беларускіх зямель, так як па сваёй форме нагадвала аналагічны інстытут сістэмы адукацыі часоў Расійскай імперыі. Неабходнасць узнаўлення была выклікана жаданнем пабудовы адукацыйнага працэса на аснове прынцыпаў адзінай працоўнай школы, вострай запатрабаванасцю ў адкрыцці новых навучальных устаноў. Школьнае інструктарства пачало ствараца пад эгідай Народнага камісарыята асветы пры Часовым Рабоча-Сялянскім ўрадзе БССР, пасля ЛітБел ССР амаль з першых дзён стварэння адзначанага камісарыята. Заснаванне дадзенага інстытута папярэднічала распрацоўцы адпаведных інструкцый, метадычных асноў функцыянавання інстытута, падрыхтоўцы адпаведных спецыялістаў. Асноўнай заканадаўчай апорай дзейнасці інструктара Народнага камісарыята асветы былі пастановы СНК РСФСР па пытаннях удасканальвання адукацыйнага працэсу. Распрацоўка абагуленай інструкцыі, як апоры асноўнай дзейнасці школьнага інструктара, у адзначаны перыяд не была распачата. Гэты факт выклікаў шматлікія цяжкасці ў функцыянаванні інстытута.

Функцыі школьнага інструктара заставаліся амаль нязменнымі на працягу разглядаемага адрэзку часу: прагандысцка-агітацыйная, арганізацыйна-распарадчая, кантралюючая, метадычная [1, с. 106-108]. Інструктары, як прадстаўнікі Народнага камісарыята асветы, накіроўваліся на месцы дзеля вядзення агітацыйнай і метадычнай працы. Падрыхтаваць мясцовыя педагагічныя кадры да пераходу на новую сістэму адукацыі, аказаць неабходную дапамогу ў рэарганізацыі былых навучальных устаноў у адну з форм адзінай працоўнай школы – такім быў асноўны змест працы інструктараў. Часта інструктары выконвалі і фіскальную функцыю: выплачвалі заработную плату мясцовым настаўнікам з атрыманых матэрыяльных сродкаў ад Наркамата асветы [2, л. 14].

Інструктары выконвалі таксама загад Наркамата асветы па зборы статыстычных дадзеных аб развіцці навучальных устаноў краю.

Спецыяльна распрацаваныя апытальныя анкеты перадаваліся праз інструктараў на месцы кіраўнікам навучальных устаноў. Вылучалася некалькі тыповых анкет: анкета аб навучальнай установе, якая ўтрымлівала агульную інфармацыю; асабовая анкета педагагічнага склада, анкета аб матэрыяльнай базе навучальнай установы. Прыведзены статыстычны матэрыял, які быў сабраны пры дапамозе школьных інструктараў, змяшчае шматлікую інфармацыю аб развіцці пачатковых навучальных устаноў, збіраўся для павышэння ўзроўня інфармаванасці Народнага камісарыята асветы [3].

Дадзены інстытут існаваў са шматлікімі праблемамі: прыняцце экстраных мер Наркамата асветы дзеля стварэння сеткі навучальных устаноў, адпавядаючых нормам адзінай працоўнай школы, часта ажыццяўляўся дырэктыўна, без арганізацыі дзейснага кантроля за выкананнем распараджэнняў, без апоры на неабходную метадычную базу; да гэтага дадаваўся недахоп матэрыяльных сродкаў, неабходных адукаваных кадраў.

Увядзенню савецкай мадэлі адукацыі, разам з інстытутам школьнага інструктарства перашкодзіла ўсталяванне польскага акупацыйнага рэжыма на значнай частцы беларускіх зямель. 21 красавіка 1919 г. польскія войскі захапілі г. Вільна, Народны камісарыят асветы быў эвакуіраваны ў Мінск. З гэтага часу Мінскі губернскі аддзел народнай асветы быў скасаваны. Пасля захопу Мінска польскімі войскамі ў жніўні 1919 г. урад ЛітБел і Народны камісарыят асветы эвакуіраваўся ў Смаленск, а затым у Рaслаўль, дзе вымушаны былі спыніць сваю дзейнасць.

Так па мадэлі Наркамата па асвеце быў створаны аналагічны інстытут з пачатку 1919 г. пры школьных радах, як грамадскіх арганізацыях. Найбольш характэрна дадзеная з’ява прасочваецца на прыкладзе дзейнасці інструктараў Беларускай Школьнай Рады Міншчыны − калегіяльнага нацыянальнага органа па вырашэнню надзённых праблем па арганізацыі адукацыйнага працэса на беларускай мове. Інструктары Рады адрозніваліся паміж сабой толькі па тэрыторыі іх асноўнай дзейнасці.

Інструктары рады выконвалі аналагічныя функцыі, што і інструктары Наркамата асветы, за выключэннем аднаго з пунктаў: інструктары рады ставілі сваёй асноўнай мэтай адкрыццё беларускамоўных навучальных устаноў. Дзейнасць школьных інструктараў Беларускай школьнай рады Міншчыны ажыццяўлялася ва ўмовах акупацыі значнай часткі беларускіх зямель польскімі войскамі, што накладвала свой адбітак на іх дзейнасць. Без адпаведнага дазволу з боку польскага акупацыйнага апарата кіравання, накіраваныя ў пэўную мясцовасць школьнымі радамі, інструктары імкнуліся пашырыць сетку беларускамоўных школ, дзякуючы правядзенню агітацыйнай працы сярод мясцовага

насельніцтва, збору сельскіх сходаў, прыняцця «прыгавораў» аб адкрыцці пачатковых навучальных установ. Па падліках, па аснове архіўных дадзеных Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (фонд 604), за перыяд 1919-1920 гг. на абшар беларускіх зямель было накіравана школьным аддзелам Цэнтральнай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, Беларускай школьнай радай Міншчыны 46 інструктараў па школьным і нацыянальна-арганізацыйным справам [4].

Уяўленне аб тыповай асобе школьнага інструктара можна атрымаць на аснове прыклада школьнага інструктара ў Барысаўскім павеце Зарэцкага Рамана Фларыянавіча, 1893 года нараджэння. Выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, студэнт сацыяльна-гістарычнага факультэта Мінскага настаўніцкага інстытута (у 1915 г. паступіў на першы курс інстытута, у 1919 г. студэнт 3 курса адзначанага факультэта). Скончыўшы 1915-1916 навучальны год, Раман Фларыянавіч быў вымушаны спыніць сваё навучанне ў інстытуце па невядомым прычынам (магчыма за службы ў войску), толькі з 1918 года яго навучанне ўзнаўляецца [5].

Частка школьных інструктараў з'яўлялася адначасова настаўнікамі ў пэўным павеце (напрыклад, Шыманскі Сцяпан, Пуроўскі Канстанцін, Шчыгельскі Канстанцін і інш.). Сумяшчэнне функцый школьнага інструктара і настаўніка была даволі распаўсюджанай, што мела свае станоўчыя моманты: такі школьны інструктар быў знаёмы з асноўнай мясцовай спецыфікай, ацэньваў падрыхтавасць мясцовага насельніцтва да адкрыцця беларускамоўнай пачатковай школы, мог атрымаць неабходную падрымку (матэрыяльную, маральную) ад аўтахтонаў [6, л. 33].

Інспектарам нацыянальна-рэлігійнага аддзела Генеральнага камісарыята ўсходніх зямель прадпісвалася ў справе «беларускіх інструктараў» прымаць неабходныя меры па прадухіленню спроб правядзення замест нацыянальна-культурнай прапаганды, правядзення палітычнай і вайскова-вербавальнай прапаганды; у выпадках выяўлення незаконай дзейнасці школьных інструктараў ажыццяўляць іх затрыманне [7, с. 695; с. 731]. Узаемаадносіны школьных інструктараў беларускіх школьных рад з мясцовымі польскімі акупацыйнымі ўладамі характарызаваліся складанасцю, што вынікала з правадзімай адукацыйнай палітыкай польскіх улад на акупіраваных беларускіх землях.

Беларуская школьная рада Міншчыны, Цэнтральная рада Віленшчыны і Гродзеншчыны для прадухілення ўзнікнення непаразуменняў паміж школьнымі інструктарамі і польскімі акупацыйнымі ўладамі выдавалі пасведчанні асобы «інструктараў па школьным і нацыянальна-арганізацыйным справам». У дадзеным пасведчанні ўказваліся правы і адпаведныя абавязкі інструктара, просьба

да мясцовых улад аб лаяльнасці і дапамозе дадзенаму спецыялісту [8, л. 352-359; л. 360].

Узнаўленне інстытута школьнага інструктарства, заснаванага яшчэ ў часы Расійскай імперыі, а пасля і пры Народным камісарыяце асветы, беларускімі школьнымі радамі падчас польскай акупацыі беларускіх зямель у 1919-1920 гг. ставіла сваёй мэтай пашырэнне сеткі беларускамоўных навучальных устаноў і прыняцце магчымых на той момант захадаў для прадухілення паланізатарскай адукацыйнай палітыкі. Дзейнасць інстытута сутыкалася з процідзеяннем акупацыйнага апарата кіравання, якое вынікала з розных мэтавых накіраванасцяў інструктараў школьных рад і польскіх школьных інспектараў.

**Літаратура**

1. Народное образование в БССР: у 2 т. / сост. Р.С. Васильева, Э.Л. Козловская. – Мінск: Народная асвета, 1979-1980. – Т. 1. 1917-1928 гг. / К.Ф. Плахотникова. – 1979. – 460 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 604. - Воп. 1. – Спр. 21. Постановление Народного контроля Литбел ССР и Минского губернского отделения госконтроля. – 56 л.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 804. − Воп. 1. – Спр. 37. Статистические сведения о школах Слуцкого уезда за 1918-1919 гг. – 187 л.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 604. − Воп. 1. – Спр. 3. Переписка с секцией Просвещения Минского магистрата об обучении на белорусском языке в школах. – 485 л.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 221. − Воп. 1. – Спр. 17. Ведомости об успеваемости и поведении студентов Минского учительского педагогического института за 1914-1921 гг. – 184 л.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 804. − Воп. 1. – Спр. 2. Переписка Комиссариата просвещения Временного Рабоче-Крестьянского правительства Белоруссии. – 36 л.
7. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 кн.: Кн.1. 1917-1920 гг. / склад. С. Шупа. − Вільня-Нью-Ёрк-Менск-Прага, 1998. – 870 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 368. − Воп. 1. – Спр. 30. Список членов Временного Белорусского Национального комитета. – 365 л.